**Заданні** **па беларускай мове ў 10 клас**

A1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *э*:
1) д_мантаж;
2) крат_р;
3) ч_рствасць;
4) шч_бятуха;
5) ш_ра-чорны.

A2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *е*:
1) штомес_чна;
2) с_кцыйны;
3) пас_вець;
4) н_веданне;
5) л_тапісанне.

A3. Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар *у/ў*:
1) гэта <u>у</u>нікальна;
2) не менш <u>у</u>важліва;
3) творы <u>У</u>ладзіміра Арлова;
4) управа і <u>ў</u>лева;
5) дай <u>ў</u>сім.

A4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *ь*:
1) ал_веола;
2) нос_біт;
3) с_вежы;
4) соцен_;
5) пласкагор_е.

A5. Адзначце словы, якія трэба пісаць *разам*:
1) (чарна) зём;
2) (школа) інтэрнат;
3) (трох) годка;
4) (ультра) фіялет;
5) (прэс) клуб.

A6. Адзначце словы, якія трэба пісаць *праз злучок:*
1) (верхня) волжскі;
2) (залаціста) саламяны;
3) (малочна) мясны;
4) (мікра) скапічны;
5) (светла) вокі.

A7. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з *не (ня)* напісаны правільна:
1) Не *трэба* казаць лішняга.
2) *Непрадчуваючы* бяды, лісіца набліжалася да рэчкі.
3) Многа ў паводзінах птушак *не разгаданых* тайн.
4) Без гэтых азёр, без гэтых палеткаў я шчасця на свеце *не знаю*.
5) Амаль *няспынна* свяцілі гірлянды нямецкіх ракет.

A8. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ужываецца *не*:
1) Такой прыгожай музыкі яшчэ ніхто на свеце _ чуў.
2) Калі б _ вяртаўся дадому, бачыў яшчэ здалёку непакорныя верхавіны дубоў.
3) _ магу _ любавацца роднымі краявідамі.
4) _ аднае бярозкі не засталося.
5) Пятровіч _ раз са сваім памочнікам начаваў на гэтым возеры.

A9. Адзначце словы, у якіх націск падае на першы склад:
1) аер;
2) весці;
4) жыхар;
5) балаваць.

3) вудзіць;

A10. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) ястраб;
2) хуччэй;
3) счасце;
4) факультэтскі;
5) таганрогскі.

A11. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:
1) Вёска_твая і мая маленькая радзіма.
2) Кожны наш дзень _ багаты на подзвігі.
3) Свая хатка _ як родная матка.
4) Задача пісьменніка _ фарміраваць, адбіраць лепшае, прыводзіць мову да літаратурных норм.
5) Кірыліца _ адна з дзвюх старажытных славянскіх азбук.

A12. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:
1) Аўсы пачынаюць шапацець густым _ ды буйным веццем.
2) Мы пазнаём адзін аднаго не толькі па голасе _ але і па тым, як кожны з нас гаворыць, вымаўляе.
3) Прасвечаныя сонцам кусты чаромхі, як лёгкія белапенныя воблакі, клубіліся ўсюды_ на здзірванелых ярах і касагорах, над шырокімі рачнымі плёсамі, азёрамі і сажалкамі.
4) Зубры цяпер ужо не ядуць ні жыта_ ні аўса.
5) Днямі_ і начамі ўсё стыла на роўнай шкляной халадэчы.

A13. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):
1) Байцы_як па камандзе_ пацясніліся.
2) Адначасова пашыралася сфера ўжывання латыні_як мовы навукі і рэлігіі.
3) Беларускі алфавіт_ як і рускі і ўкраінскі_ паходзіць са старажытнай славянскай азбукі.
4) Ашалелая спачатку страляніна ля вёскі_ быццам бы стала сціхаць.
5) Нібы сарамлівая дзяўчына_ аж гарыць ад чырвані рабіна.

A14. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):
1) О_ Радзіма, табою напоўнена сэрца да краю.
2) Шчасце_ вядома_ не раз прыходзіць нечакана.
3) Аднак_ возера нечакана сцямнела.
4) Чалавек_ скажу вам_ ніколі не павінен траціць веры.
5) Люблю лугі квяцістыя, за полем шумны гай, цябе_ мой родны край.

A15. Адзначце ***іменныя*** словазлучэнні:
1) багажны ярлык;
2) адрамантаваць тэлевізар;
3) вельмі моцны;
4) высока ў аблоках;
5) кожны з нас.

A16. Адзначце сказы, у якіх ёсць безасабовыя дзеясловы ці асабовыя, ужытыя ў значэнні безасабовых:
1) Неба і зямля зліліся ў суцэльным віхры снежнага пылу і цемрадзі.
2) Пачынаўся золкі досвітак.
3) Ціха сяджу ў буданчыку.
4) Яшчэ не ўзышло сонца, але ўжо развіднела.
5) Хочацца спяваць песні.

A17. Адзначце схему, якой адпавядае сказ з простай мовай:

*Сядайце, дзядзька гукнуў я чалавека, адчыніўшы дзверы машыны падвязём да Жытніцы*

1) «П, – а, – п».
2) «П! – а. – П».
3) «П. – а. – П».
4) «П, – а, – П».
5) «П, – А. – П».

А 18. Адзначце рады аднакаранёвых (роднасных) слоў:

1) дзень, дні, дзянькі;
2) білет, білецёр, білетны;
3) насіць, нашу, наш;
4) засыхаць, засуха, суш;
5) парк, паркавы, паркет.

А19. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) Кастуся радавала яго школа, бо за якія два месяцы яму многа ўдалося зрабіць.

2) Як многа я даў бы, каб зноў вярнуць тую восень, яшчэ раз пераажыць той добры, заспакоены восеньскі вечар калі дрэвы был вялікія, а я – шчаслівы.

3) Яшчэ ў маленстве, калі ўпершыню скіроўваеш свой погляд у неба цябе ахоплівае дзівоснае пачуццё.

4) Вясёлага званара пачулі манашкі-чарнарызніцы ў Спаскім манастыры, які стаіць на поўнач ад Полацка ў лугавіне Палаты і які заклала Еўфрасіння, дачка князя Георгія Усяслававіча.

5) Колькі гадоў таму дубу, ніхто з вяскоўцаў не памятае.

А20. Адзначце правільныя сцверджанні:

1) Арфаграфічныя слоўнікі вызначаюць правільнае напісанне слоў.
2) Да спецыяльнай лексікі адносяцца толькі тэрміны.
3) Пасля апострафа і мяккага знака літары е, ё, ю, я, і абазначаюць два гукі.
4) Суфіксы інфінітыва з'яўляюцца формаўтваральнымі.
5) У безасабовым сказе ролю выказніка могуць выконваць толькі прыслоўі.

А21. Устаўце прапушчаныя літары, пастаўце, дзе неабходна знакі прыпынку.

*Бя..конца імжыць, штос..ці шэпча дробны дож..ык. Ветрык л..ніва гартае мокрае лісце на грушы. Час а.. часу дождж прыпыняец(цц)а, здаец(цц)а, а..пачывае а потым зноў пачынае сваю працу. Апошнія антонаўкі добра вымытыя дажджом у(ў)прыгожваюць старую яблыню, быц(цц)ам навагоднія цацкі. Памыліся і запозненыя р..знакаляровыя вяргіні – кветкі восені.*

*Куры натапырыўшыся сядзяць ля сцяны хаты і відаць стаміліся чакаць, калі перастане сыпаць надакучлівы непатрэбны дождж. Статак кароў нягледзячы на макрэчу. павольна накіроўваец(цц)а за вёску, на верасовую палянку. Верас цвіце. На у(ў)злеску – памытая дажджом рабіна, а..сыпаная буйнымі цяжкімі чырвонымі ..ронкамі.*

*А поле сумуе, а..аўшы свае дары чалавеку.*

А22. Вызначце стыль і тып тэксту. Адказ запішыце ў форме назоўнага склону.

**Заданні для правядзення ўступных іспытаў на беларускай мове ў 10 клас у ліцэі**

A1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *а:*

1) ж_ўтавалосы;
2) д_сант;
3) куж_ль;
4) мн_гатомны;
5) хр_шчэнне.

A2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *е:*

1) б_ларусістыка;
2) б_люткі;
3) г_олагаразведка;
4) за_ц;
5) кал_графія.

A3. Адзначце прыклады, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *у (складовае):*

1) адпаведны _зрост;
2) водар дзядоўнік_;
3) за _нівермагам;
4) пабудаваў _ласны дом;
5) польска-_краінскі.

A4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць *апостраф:*

1) аб_едзены;
2) Джаван_ёлі;
3) міжзор_е;
4) недал_е;
5) суб_ядзерны.

A5. Адзначце словы, якія трэба пісаць *разам:*

1) (авія) здымка;
2) (вада) збор;
3) (жук) дрывасек;
4) (макра) свет;
5) (шхуна) яхта.

A6. Адзначце словы, якія трэба пісаць *праз злучок:*

1) (залаціста) пурпуровы;
2) (ліста) падаўскі;
3) (крытыка) біяграфічны;
4) (руса) косы;
5) (што) мінутны.

A7. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з *не* напісаны правільна:

1) Было чуваць шастанне галля ў зарасніку, нечая *невыразная* гаворка.
2) Вялае бацвінне, *неачуняўшы* за кароткую ноч, бяссільна ляжала на сухой зямлі.
3) Гэткае моцнае дружбы ў свеце *не знойдзеш* нідзе!
4) Дырэктар *не зменна* займаў сваё месца.
5) *Не ўсё* тое рыба, што ў вадзе плавае.

A8. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ужываецца ***не***:

1) Валодзька прыходзіў сюды ледзь _ кожны дзень, часам і _ адзін раз.
2) Хутка паляцела слава, як ваявалі змагары, і _ падлічаць іхняй справы _ палеткі, _ бары.

3) Колькі б _ прайшло часу, раптам сярод неспакою ўспомніцца гэты момант.
4) _ адзін не адмовіўся ад прапановы.
5) Ці _ лепш было б табе паехаць працаваць у вёску?

A9. Адзначце словы, у якіх націск падае на другі склад:
1) блiснуць;
2) магазін;
3) далей;
4) цяжар;
5) заімка.

A10. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) абрэзванне;
2) забыццё;
3) закругленны;
4) злосццю;
5) камiссiйны.

A11. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў *абавязкова* ставіцца працяжнік:
1) Беларусь _ гэта белая птушка ў блакіце нябёсаў.
2) Апошняя восень стагоддзя _ таксама цёплая, ціхая і сонечная.
3) Сену прыбаўка _ атаўка.
4) Дуб _ быццам вартавы гэтых абшараў.
5) Губы яе _ лiлii, што выліваюць цягучую міру.

A12. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:
1) Віцябляне ганарацца сваім горадам_ берагуць мінулае, ахоўваюць клапатлівымі рукамі гістарычныя мясціны.
2) Бялявы рэдкі туман нізка слаўся па вадзе_ і засцілаў сярэдзіну возера.
3) I ў кожным дрэве_ і былінцы, і ў малюпасенькай раслінцы шукае радасць спадзявання.
4) Малы адвык ужо клікаць па помач бабулю_ ці маму і пачынае свой дзень самастойна.
5) Зацвіталі самыя раннія кветкі_ пралескі, кураслеп, лотаць.

A13. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):
1) Камель сасны быў так выцерты жывёлай, што блішчэў на сонцы_ бы наглянцаваны.
2) Першы цырк знаходзіўся на Саборнай плошчы, і гараджане ведалі яго_ як цырк Нікіціна.
3) Пятровіч стаяў на беразе, а мінулае, даўняе_ нібы праплывала перад яго вачыма.
4) Наша Брэстчына_ як мала які куток Беларусі_ мае багатую прыроду і слаўную гісторыю.
5) Яшчэ не паспела_ як след_ распусціцца клейкая маладая лістота на дрэвах.

A14. Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі:
1) У алешніку быў вільготны халадок *нават* цяпер, у такую гарачыню.
2) Ох *дачушка* хлеб твой горкі, горка твая доля.
3) *Па-мойму* збіраецца на дождж.
4) Сядзіба калгаса *відаць* яшчэ за некалькі кіламетраў.
5) Качкі паспяшаліся плысці да берага, *можа* адчулі, што набліжаецца бура.

A15. Адзначце словазлучэнні:
1) уздоўж лесу;
2) густы і нізкі;
3) адпачываць у садзе;
4) зязюля кукавала;
5) будаўнічы матэрыял.

16. Адзначце дзеясловы, ад якіх утвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання:

1) адключаць;
2) атрымаць;
3) выпраміць;
4) вячэраць;
5) загаіць.

A17. Адзначце схему, якой адпавядае сказ з простай мовай:

*Цікава, адкуль гэта ўзялася ў клеці ласіная шкура думае Данілка а можа, бацька знайшоў гэтую шкурку ў лесе ці адабраў у якога браканьера*

1) «П? – а: – П?»
2) «П? – а.– П?»
3) «П, – а. – П».
4) «П? – а, – П?»
5) «П?» – а. – «П?»

A18. Адзначце словы з нулявым канчаткам:

1) заручальны;
2) алібі;
3) белым;
4) Нарач;
5) пяцьсот.

A19. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) У сутках ёсць пара такая, калі зары палоска гасне і змрок спаўзае пад адхон, калі становіцца няясным, як летуценне, лёгкі сон.
2) Лес, што цягнецца паўз Дняпро пачынаецца з гэтых дубоў.
3) Я скончыў тое аддзяленне, на якое пастулаў, атрымаў тую адукацыю да якой гарнулася душа.
4) Ледзь-ледзь пачынала днець, калі над лугам і ў нізінах стаў падымацца малочны туман.
5) Хлопец абыходзіў лес, быццам хацеў упэўніцца, што пакуль яго не было, усё тут засталося на месцы.

A20. Адзначце правільныя сцверджанні:

1) Выклічнік — нязменная часціна мовы, якая выражае розныя пачуцці, эмоцыі, пабуджэнні, але не называе іх.
2) Дзеепрыметнікі ўтвараюцца ад прыметнікаў.
3) Літары *ы, э, о, а* заўсёды абазначаюць адзін галосны гук.
4) Не належаць ні да аднаго з тыпаў скланення толькі назоўнікі, якія ўжываюцца ў множным ліку.
5) Мнагазначныя словы могуць утвараць некалькі антанімічных пар, суадносных з кожным значэннем мнагазначнага слова.

A21. Устаўце прапушчаныя літары, пастаўце, дзе неабходна знакі прыпынку.

Жырафа самая высокая жывёла. І выгляд у(ў) яе вельмі д(дз)іўны. До..гая трохметровая шыя выцягнута у(ў)верх, быц(цц)ам т..леграфны слуп. А на ёй мален..кая галоўка с(з) каро..кімі ро..камі. Іншай жывёле напіц(цц)а працей простага была б вада. А у(ў) жырафы галава на ш..сць метраў над зямлёй паднята. Не адразу да вады данягне..ся.

У продкаў жырафы, якія апынуліся у(ў) саваннах Афрыкі, былі кароткімі ногі і шыя. Але жырафа пасец(цц)а не на траве. Яе паша кроны дрэў. І каб даставаць лісты і галінкі, давод(дз)ілася цягнуцца у(ў)верх.

Звычайна жырафы кормяц(цц)а раніцай і у(ў) другой палове дня. А у(ў) гарачы час дрэмлюць у(ў) цяні акацый. Пл..містая афарбоўка добра маскіруе іх, а высокі рост дапамагае лепш бачыць драпе..ніка.

A22. Вызначце стыль і тып тэксту. Адказ запішыце ў форме назоўнага склону.